Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 29 (617) Пятніца, 22 кастрычніка 1965 г. Год выдання XVIII Цана 1 кап.

**12 кастрычніка 1965 года адбыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі. Пленум абмеркаваў наступныя пытанні.**

**1. Аб мерах па выкананню пастановы вераснёўскага Пленума ЦК КПСС «Аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю, удасканаленні планавання і ўзмацненні эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці».**

**2. Аб скліканні чарговага XXVI з'езда КПБ.**

**Па абмеркаваных пытаннях пленум ЦК КПБ прыняў пастановы. Вырашана склікаць чарговы з'езд Камуністычнай партыі Беларусі 3 сакавіка 1966 года.**



Ажыўлена абмяркоўваюць хімфакаўцы рашэнні вераснёўскага Пленума. На здымку справа налева: **Павел Аскерка**, які неўзабаве стане працаваць на Салігорскім калійным камбінаце, **Зоя Рагошкіна, Віктар Герасімаў,** які паедзе на Гомельскі суперфасфатны, а таксама іх малодшыя сябры другакурснік **Васіль Артамонаў** і трэцякурснік **Генадзь Кажушкоў**.

# НОВЫЯ ДАЛЯГЛЯДЫ

Бурнымі тэмпамі развіваецца наша сацыялістычная прамысловасць. Па сямігадоваму плану яе прадукцыя павінна была павялічыцца на 80 працэнтаў. На справе ж яна ўзрасла на 84. За сем год пабудавана і ўведзена ў строй больш як 5,5 тысяч буйных прадпрыемстваў. І развіваецца яна больш высокімі тэмпамі, чым прамысловасць ЗША. Сярэдні гадавы тэмп росту вытворчасці ў сямігодцы склаздзе 9,1 працэнтаў, тады як у ЗША толькі 3,9.

Ды разам з вялікімі дасягненнямі ў прамысловасці ёсць яшчэ шэраг недахопаў. Марудна ўкараняюцца ў вытворчасць навейшыя дасягненні навукі і тэхнікі, замаруджваецца ў сувязі з гэтым тэмп росту прадукцыйнасці працы і нацыянальнага прыбытку, што ў сваю чаргу стрымлівае павышэнне дабрабыту народа.

Каб хутчэй ліквідаваць гэтыя недахопы, паўней скарыстоўваць магчымасці і перавагі сацыялістычнага грамадства, патрэбна было правесці эканамічную рэформу. Прымаючы ўсё гэта пад увагу, нядаўні вераснёўскі Пленум ЦК і распрацаваў сістэму мерапрыемстваў, якія дапамогуць ліквідаваць недахопы ў росце прамысловасці, забяспечаць новы магутны ўздым эканомікі краіны.

Рашэнні Пленума прадугледжваюць удасканаленне сістэмы планавання, узмацненне гаспадарчай ініцыятывы прадпрыемстваў і эканамічнага стымулявання, а таксама палепшанне кіравання прамысловасцю.

Вялікае значэнне набывае зараз удасканаленне планавага кіраўніцтва эканомікай краіны, павышэнне навуковага ўзроўню дзяржаўнага планавання. Народныя гаспадарчыя планы павінны звязвацца з навукова-тэхнічным прагрэсам, грунтавацца на рэальных і аб'ектыўных разліках. У кіраўніцтве прамысловасцю на першае месца выступяць чыста эканамічныя метады. Гаспадарчы разлік, які дагэтуль нярэдка меў чыста фармальны характар, паслядоўна ўкараніцца ва ўсе звенні гаспадаркі. Значна пашыраюцца правы і гаспадарчая самастойнасць прадпрыемстваў, ліквідуюцца непатрэбныя абмежаванні і рэгламентацыі, залішняя апека над прадпрыемствамі з боку вышэйшых установ. У гаспадарчай дзейнасці вялікае значэнне набываюць цяпер такія рычагі, як прыбытак, цана, прэмія, крэдыт, матэрыяльная зацікаўленасць рабочых.

Для паляпшэння кіраўніцтва прамысловасцю Пленум вырашыў арганізаваць яго па галінах вытворчасці, стварыць адпаведныя саюзна-рэспубліканскія і агульна-саюзныя міністэрствы.

Перабудова ўпраўлення прамысловасцю — гэта не зварот да старых форм кіравання, якія існавалі да 1957 года. Міністэрствы будуць працаваць на аснове новых прынцыпаў планавання і кіравання, калі ўзрастае роля чыста эканамічных метадаў кіраўніцтва, а прынцып цэнтралізаванага кіравання будзе спалучацца з шырокай ініцыятывай з месц.

Пастановы Пленума ЦК сустрэты з вялікім задавальненнем камуністамі, усімі працоўнымі. Вывучэнне яго рашэнняў праходзіць у абставінах высокага палітычнага ўздыму. Абмяркоўваючы іх, працоўныя выяўляюць новыя рэзервы паляпшэння работы, намячаюць канкрэтныя шляхі павышэння прадукцыйнасці працы, якасці прадукцыі, эканамічнага вядзення гаспадаркі.

Нашай першачарговай задачай з'яўляецца глыбока вывучыць рашэнні Пленума і давесці іх сутнасць да кожнага камуніста, кожнага працоўнага. Тлумачэнне рашэнняў Пленума павінна знайсці шырокае месца ў вучэбным працэсе, асабліва пры выкладанні грамадскіх навук. Выключна адказныя задачы стаяць цяпер перад работнікамі кафедры палітэканоміі як па прапагандзе рашэнняў Пленума, так і ў распрацоўцы тэарэтычных праблем.

Як вядома, многія спецыяльныя кафедры і лабараторыі нашага універсітэта паспяхова вядуць даследчую работу ў тых ці іншых галінах навукі і тэхнікі. Іх задача цяпер у тым, каб яшчэ больш актыўна ўносіць свой уклад у навукова-тэхнічны прагрэс і дабівацца неадкладнага ўкаранення сваіх даследаванняў у вытворчасць, у агульную справу навукова-тэхнічнага прагрэсу, развіцця і паскарэння тэмпаў будаўніцтва матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма.

**А. П. СКУМАН,**
**дацэнт кафедры палітэканоміі.**

# АБРАНЫ ДАСТОЙНЫЯ

**Ва універсітэце прайшлі справаздачна-выбарныя камсамольскія сходы. Сакратарамі факультэцкіх арганізацый абраны наступныя таварышы:**

**Фізфак — Ігар ШЫНГЕЛЬ (4-ты курс);**
**Матфак—Уладзімір БУБНОЎ (4-ты курс);**
**Філфак — Міхаіл ЦІВА (2-гі курс);**
**Біяфак—Алег БЕЛЯНКЕВІЧ (2-гі курс);**
**Хімфак—Сяргей СТРОЙКІН (1-шы курс);**
**Геафак — Мікола МІХЕД (3-ці курс);**
**Гістфак — Аркадзь МІСУНА (3-ці курс);**
**Юрфак—Сяргей САЎЧАНКА (2-гі курс).**

# ПАГЛЫБЛЯЦЬ ВЕДЫ!

**Пры нашым універсітэце створан гарадскі лекторый па пытаннях выхавання школьнікаў у сям'і. Ён напэўна прыцягне ўвагу не толькі выкладчыкаў, аспірантаў, студэнтаў-бацькоў, але і студэнта як будучага настаўніка. Мы змяшчаем артыкул адказнага за арганізацыю лекторыя старшага выкладчыка кафедры педагогікі і псіхалогіі Р. І. Вадэйкі.**

*Камуністычнае выхаванне маладога чалавека — адна з важнейшых задач нашага грамадства. Наш універсітэт прызван дапамагаць у гэтым бацькам. Ужо ў мінулым годзе па рашэнню «Савета садзеяння сям'і і школе Белдзяржуніверсітэта імя Ул. І. Леніна» быў арганізаван і праводзіў работу лекторый для бацькоў, дзеці якіх вучацца ў школах Ленінскага раёна горада. Бацькі з увагай праслухалі лекцыі аб выхаванні школьніка. Перад імі выступілі ўсе члены кафедры педагогікі і псіхалогіі. Па просьбе настаўнікаў лекцыі чыталіся таксама непасрэдна ў школах. У гэтым годзе лекторый значна пашырае сваю работу, запрашаючы лектарамі і супрацоўнікаў навукова-даследчага інстытута педагогікі.*

*Шматлікія, цікавыя пытанні ўзнімаюць дакладчыкі: аб асаблівасцях выхавання школьніка пачатковых, сярэдніх і старэйшых класаў, аб выхаванні волі і характару, павагі і любві да кнігі, атэізму і іншага. Пасля лекцый будуць дэманстравацца кінафільмы, прысвечаныя праблемам выхавання.*

*Хочацца верыць, што як і ў мінулыя гады, аўдыторыя ў нас будзе шматлікай.*




**ДНЯМІ выкладчыкі універсітэта, аспіранты, студэнты праслухалі цікавую лекцыю «Роля Нацыянальнага Фронту Дэмакратычнай Германіі і дэмакратычных партый ГДР у барацьбе за перамогу сацыялістычнага ладу на нямецкай зямлі».**

**Лекцыю прачытаў інструктар аддзела прапаганды ЦК САПГ таварыш Ганс Генрых Ангермюллер.**

**НЯДАЎНА у нашым універсітэце былі гасцямі вядомыя вучоныя Акадэміі навук СССР прафесар А. А. Грынберг і старшы навуковы супрацоўнік Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі Ю. С. Варшаўскі. Яны далі рад кансультацый па некаторых пытаннях сучаснай каардынацыйнай хіміі, фізіка-матэматычных метадаў даследавання комплексных злучэнняў.**

**Вучоныя саюзнай акадэміі прачыталі таксама для прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў лекцыі па агульных праблемах сучаснай каардынацыйнай хіміі і інфрачырвонай спектраскапіі комплексных злучэнняў.**

**ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ абран новы склад камісіі партыйна-дзяржаўнага кантролю. На першым яго пасяджэнні выступіў старшыня А. А. Галаўко. Ён падрабязна спыніўся на абавязках і задачах, якія стаяць перад членамі камісіі.**

**У ПАМЯШКАННІ даведачна-бібліяграфічнага аддзела адбылося пасяджэнне Бібліятэчнага Савета. Аб стане і задачах камплектавання вучэбных кабінетаў расказала Я. С. Іваноўская. Аб стане выпіскі перыядычнай літаратуры на 1966 год дакладвала Р. Г. Любіна, аб плане работы Савета на бягучы вучэбны год—прафесар В. А. Дзяменцьеў.**

# СА СТУДЭНЦКАГА ДЗЁННІКА

★ ★ ★

## СТУДЭНТЫ ПРЫЕХАЛІ

Свежая чутка, як рэха.
Моладзі радасць дык радасць!
— Студэнты прыехалі!
— Студэнты прыехалі!
Цэлая, кажуць, брыгада!..
— Напэўна канцэрт закоцяць
Для нас на высокім узроўні,
Каб мы не памерлі ў маркоце...
— Ды не! Будаваць
кароўнік!..
Глядзяць дзядзькі і не вераць:
«Не будаўнікі, а турысты.
Няма ні цясла, ні сякеры —
Адны на плячах
транзістары...»
Старшыня на канторскім ганку
Гаворку пачаў умела:
— Доўгачаканыя!
Якраз у пару прыспелі.
Будынак патрэбен рагулям,
А сілы...
А сілы няхватка.
Скажыце,
Нашто вы цягнулі
Да нас у калгас палаткі?
Адно,
Калі вы ў дарозе,
То нельга без гэтых трантаў.
А тут нашы цёткі возьмуць
За радасць такіх кватарантаў.
У іх—жыццё залатое:
Бліны—можа чулі?—дранікі...
Вас будуць паіць сырадоем
Упоўдзень,
увечар
і раніцай.
Хапае для вас прастору:
Вунь возера,
побач—лазня...
Адно, папрашу з уговорам:
Да нас у сады не лазіць!
Калі надакучаць пілы —
Зачэрпняце рыбкі гантам...
Так будзеце, колькі ёсць сілы,
Сабе здабываць рамантыку.

## КАНІКУЛЫ

Інтэрнат, нібы на прыстані
крэйсер,
Жыхароў выгружае на лета.
Ён праплыў без аварыі дзве
сесіі,
Прывёзшы канікулы для
студэнта.

Пакоі пусцеюць не вельмі
ахвотна,
Ды заўтра ніводнай душы
не знойдзецца.
Трошкі ўзрушаны, трошкі
маркотны
Камендант, як дамавік, па
лесвіцы споўдаецца.

Сёння кожнаму з нас не
спіцца.
Бо самая большая з усіх
трывог,
Што не ў нашых вачах
ружавеюць суніцы
І без нас у гумно звозяць
мурог.

Недзе каса ад радасці плача
росамі,
Каня ў брыгадзіра жаласна
просіць піць.
Самы вялікі рай—гэта
босаму
З бацькавай касой па расе
пахадзіць.

*Мар'ян ДУКСА*

## «СОС»

*Аж цэлы, цалюткі*
*месяц —*
*Такі ўжо студэнцкі лёс—*
*Бяскрыўднае слова*
*«сесія»*
*Гучыць, як трывожны*
*«СОС».*
*І час хоць бяры ў арэнду,*
*Закідвай газету і верш,*
*А то праваронiш*
*стыпендыю*
*І кпіны сяброў нажывеш.*
*Спыніліся спрэчкі*
*і жарты —*
*Спатканняў тым болей*
*няма...*
*Сядзіш над канспектам*
*упарта*
*З халоднай душой,*
*як зіма.*
*Мы ўсе барыкады*
*будуем,*
*Наклаўшы падручнікаў*
*стос,*
*І гонар студэнцкі ратуем,*
*Нібыта тапельца ў*
*«СОС».*

## СМАРГОНСКАЯ АКАДЭМІЯ

Чамусьці ў падручніках
па гісторыі
Нідзе не вычытаеш сягоння
Пра акадэмію гэту, каторая
Была адчынена ў Смаргоні.
У ёй прафесарам недзе
По горла хапала працы:
Не так-то лёгка мядзведзю
Даць вышэйшую адукацыю!
Прафесары ахалі, охалі,
Кіямі Мішку ганялі.
А каля варот скамарохі
Ужо
з ланцугом стаялі.
Цану вызначалі прыблізна,
Скрыжоўвалі
рукі ў згодзе...
Нарэшце, з варот вялізны
З «дыпломам» артыст
выходзіў.
Пасля
тупацеў па шашы ён —
Іржалі спалохана коні,
Вісеў барабан на шыі,
А збоку гайдаўся гармонік.
Ішоў у кашулі і лапцях...
Імчаліся людзі на крыллях,
Каб глянуць, як касалапы
На задніх танцуе кадрылю.
Было чым пасля ласавацца
На сытым і смачным абедзе...
Смяяўся народ:
— З адукацыяй
Лягчэй пражыць і мядзведзю.



Студэнты нашага універсітэта працуюць цяпер на ўборцы бульбы ў розных калгасах Мінскай вобласці.

НА ЗДЫМКАХ: (злева) вы бачыце студэнтаў III курса біяфака. Брыгадзір дае нарад на работу.

І вось пачалася дружная праца (здымак унізе).

Фота А. Кадзета
і М. Карыцкага.

## ЭСТАФЕТА ПРЫНЯТА

Сто дваццаць адзін замежны студэнт вучыцца зараз на падрыхтоўчым факультэце нашага універсітэта. Сярод навучэнцаў — пасланцы Кубы, Ганы, Кеніі, Малі, Танзаніі, Самалі. Разам з імі вывучаюць рускую мову студэнты з Мазамбіка, С'ера-Леоне, Партугальскай Гвінеі і каралеўства Бурундзі. Летам наступнага года гэта будзе ўжо пяты выпуск падрыхтоўчага факультэта, які мае ўжо сваю гісторыю, добрыя традыцыі. І каб перадаць іх, як эстафету, навічкам, што нядаўна ўліліся ў дружную сям'ю студэнцтва, выкладчыцкі калектыў разам з замежнымі студэнтамі-выпускнікамі розных гадоў наладзілі вечар сустрэчы з першакурснікамі.

На яго з'ехалася многа гасцей. І кожны не мог не спыніцца ля вялізнага фотамантажа «Яны вучыліся ў БДУ імя Ул. І. Леніна на падрыхтоўчым факультэце».

Вечар адкрыў дэкан падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян дацэнт С. Я. Янчанка.

Дзяцей розных народаў пад воплескі па-бацькоўску цёпла вітаў рэктар універсітэта акадэмік А. Н. Сеўчанка.

Кубінец Эстэбан Альфонса займаецца зараз на хімічным факультэце, а студэнт з Ганы Джон Флетчар — на фізічным. У Беларускім політэхнічным інстытуце на розных факультэтах вучацца кеніец Роберт Кейча, студэнт з Ганы Ампожа Сампсон і з Танзаніі Кейза Джусцін. У розныя гады яны закончылі наш падрыхтоўчы факультэт, але зноў прыйшлі сюды на вечар. Адзін за другім бяруць яны слова, віншуюць сваіх малодшых сяброў, даюць карысныя парады, якія неабходны ў далейшым для вучобы па выбранай спецыяльнасці. І ўсім зразумелы іх сяброўскія клопаты пра малодшых, бо радзіма кожнага чакае высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Менавіта, гэтую думку падкрэсліў у сваім выступленні сакратар парткома універсітэта доктар гістарычных навук І. М. Ігнаценка, пажадаўшы малодшаму папаўненню добрых поспехаў у вучобе.

**Ул. ГАЛАЙША.**

## *Двойка?.. Дрэнна! Тройка?.. А чым яна лепш?*

Штогод у наш універсітэт прыходзіць шмат юнакоў і дзяўчат, каб атрымаць вышэйшую адукацыю. У гэтым годзе на 1270 месц было пададзена 4607 заяў, у тым ліку 976 медалістаў. З абітурыентаў-медалістаў паступіла 351 чалавек. Гэтая лічба гаворыць аб тым, што конкурсны адбор на ўсе факультэты праходзіў сапраўды пры высокім бале. І трэба сказаць, што такі высокі прахадны бал у нас не першы год. Ён быў ужо такім, пасутнасці, і ў 1960 годзе. Але чаму ж гэта атрымалася так, што з ліку прынятых у 1960 годзе да цяперашняга часу выбыла восемдзесят чалавек. Дзе ж дзелася амаль цэлая сотня студэнтаў?!.. Аказваецца, большасць з іх выключана...

І зноў жа чаму? Чаму студэнт пачаў атрымліваць двойкі і, урэшце, яго, як кажуць, пагналі?..

Адказваць на гэтае пытанне не так проста.

Ва універсітэце моцны прафесарска-выкладчыцкі калектыў. У лабараторыях да паслуг студэнтаў навейшая апаратура. Ёсць буйнейшая па кніжнаму фонду бібліятэка. Адным словам, закасвай рукавы і вучыся. А тут — на табе! — Двойкі. Першая прычына — у самім табе, двоечнік! Калі ты не адчуваеш ніякай маральнай адказнасці перад калектывам, не наведваеш лекцый, не працуеш над сабой, лічыш, што, маўляў, «тройку як-небудзь паставіць выкладчык», вось тут яна цябе і падпільноўвае — зусім не фатальная, а гультайная — ад твайго гультайства — двойка! А бывае староста курса, твае нібы сябры — студэнты робяць выгляд, што не заўважаюць тваёй абыякавасці, размагнічанасці, наплюй-на-усё-настрою. А што, каб цябе, такую цацу, адразу ж за вушы ды на сонейка. Каб ты і не апомніўся — сабраць камсамольскі актыў, прапясочыць як след, замацаваць за табой, сябра, лепшага студэнта. А калі гэта не дапамагае — выключыць спачатку ўмоўна. Мала будзе табе гэтага, не возьмешся за навуку — бывай здароў! Няма чаго нам з табой валаводзіцца.

І, нам здаецца, што такое пытанне патрэбна ставіць не толькі двоечніку, але і перад троечнікам. Не даваць яму спакойна адлежвацца на сумніцельных лаўрах троек, а зрабіць яму мулкай да невыноснасці рэдзенькую посцілку троек. Летнюю сесію 1551 студэнт здаў на «тройкі». Ці ж гэта цярпіма? А ў нас шмат і такіх, што на працягу вучобы не атрымалі ніводнай адзнакі вышэй «здавальняюча». Гэта такія студэнты фізфака, як Гурскі, Васілеўскі, Кавалёва, Дзерачэнік, Гурбан, Паўлаў.

Рэктарат, прафесарска-выкладчыцкі калектыў, грамадскія арганізацыі універсітэта сваю галоўную ўвагу канцэнтрыруюць галоўным чынам на двоечніках. А з троечнікаў атрымліваюцца таксама невысокакваліфікаваныя спецыялісты!..

А што вы думаеце, таварышы выкладчыкі і студэнты?

**В. ПРАКАПЕНКА,**
**член камітэта камсамола універсітэта.**
**І. ШЫНГЕЛЬ,**
**сакратар камітэта камсамола. фізфака.**

Рэдактар А. ЛОЙКА.



АТ 10339 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19. Друкарня Выдавецтва «Звязда» Тыр. 2000. Зак. 1139